**ГРАНТАВАЯ ПАДТРЫМКА Ў НАВУЦЫ**
Пра матэрыяльную і інфармацыйную дапамогу размаўляем са старшынёй савета маладых навукоўцаў БДУ
Стар. 2

**СПЯКОТНЫ ЧАС ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ**
На пытанні абітурыентаў і студэнтаў адказвае намеснік старшыні прыёмнай камісіі К.У. Казадаеў
Стар. 3

**ПРАЦОЎНЫ ДЗЕНЬ З КІРОЎЦАМ**
Наш карэспандэнт даведалася пра працоўны графік Мікалая Шукалы
Стар. 6

**СКАРБОНКА ТАЛЕНТАЎ БДУ**
Знаёмімся з навучэнцамі, якія трапілі ў банк даных адоранай моладзі Беларусі
Стар. 7

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

18 ліпеня 2023 года, № 7 (2272)

## Пяць пагадненняў падпісаны паміж БДУ і расійскімі ВНУ на Х Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі



Маштабнае мерапрыемства праходзіла ў гэтым годзе ў г. Уфа (РФ, Рэспубліка Башкартастан). Яго ўдзельнікам стала дэлегацыя БДУ на чале з рэктарам Андрэем КАРАЛЁМ.

Заверaны пакет дакументаў дазволіць пашырыць і ўмацаваць міжуніверсітэцкае ўзаемадзеянне ў сферы адукацыі, навукі і маладзевай палітыкі з Расіяй. Ён адлюстроўвае як новыя дамоўленасці аб супрацоўніцтве, так і абнаўленне і дэталізацыю наяўных адносін.

Упершыню заключана пагадненне з Расійскім эканамічным універсітэтам імя Г. В. Пляханава, з якім на палях форуму падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве і студэнцкіх абменах. З Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным універсітэтам абноўлены дакументы і дадаткова падпісаны пратакол аб акадэмічным і навуковым абмене. Перападпісана дамова аб супрацоўніцтве з Валгаградскім дзяржаўным універсітэтам. Усе дакументы прадугледжваюць садзейнічанне ў арганізацыі абмену навуковай інфармацыяй, студэнтамі і выкладчыкамі, працу над сумеснымі адукацыйнымі, даследчымі праектамі, узаемнае чытанне лекцый, інфармаванне аб праграмах навучання, а таксама правядзенне навукова-адукацыйных мерапрыемстваў, выданне сумесных публікацый.

Цэнтральнай падзеяй Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі стала пленарнае пасяджэнне з удзелам кіраўнікоў міністэрстваў і ведамстваў, органаў дзяржаўнай улады, прадпрыемстваў і арганізацый, прадстаўнікоў дзелавых колаў дзвюх краін. Таксама прайшлі дзевяць тэматычных секцыйных пасяджэнняў і дыскусій. Дэлегацыя БДУ прыняла ўдзел у працы секцыі «Гуманітарнае супрацоўніцтва Расіі і Беларусі. Вынікі дзесяцігоддзя і перспектывы развіцця». Акрамя таго, у рамках форуму было прадстаўлена больш за 20 распрацовак БДУ на выставе «Made in Belarus». У экспазіцыю ВНУ ўвайшлі лёгкаплаўкія пакрыцці і парашкі на аснове сплаву волава з золатам, серабром, меддзю, нікелем, вісмутам. Гэта новы від пакрыццяў, распрацаваных для нанясення ахоўных, функцыянальных і дэкаратыўных слаёў на аснове металаў, сплаваў і кампазітаў. Сфера прымянення навацыі вельмі шырокая і ахоплівае прыборабудаванне, радыётэхніку, мікраэлектроніку, цяжкае машынабудаванне, нафтахімію, вытворчасць галантарэйных вырабаў, прадметаў хатняга ўжытку, бытавой тэхнікі, фурнітуры для адзення, абутку, мэблі і інш.

Лінейку медыцынскіх прэпаратаў дапоўнілі супрацьпухлінныя лекі «Цысплацэл», «Праспідэлонг» і «Тэмадэкс». Першы прымяняецца пры выдаленні пухлін у вобласці галавы і шыі, «Праспідэлонг» і «Тэмадэкс» маюць гідрагелевую субстанцыю і выкарыстоўваюцца для лакальнай хіміятэрапіі пухлін страўніка і галаўнога мозгу адпаведна. Акрамя таго, навукоўцы БДУ прадстаўлялі ветэрынарныя біяпрэпараты для лячэння і прафілактыкі хвароб сельскагаспадарчых жывёл «Цыпрапіг», «Біферон – МРС», «Цыркол»; рэсурсазберагальнае тэхналагічнае абсталяванне для вытворчасці вырабаў з эластычных, інтэгральных і жорсткіх пенапаліўрэтанаў; шматфункцыянальны вымяральны комплекс Alma Meter – 2; полілактыдныя матрыксы для зрошчвання костак, фітасолі харчовыя дыетычныя прафілактычныя серыі «Універсум» з паніжаным утрыманнем хлорыстага натрыю і інш.

Расія з'яўляецца для БДУ прыярытэтным і адным з ключавых партнёраў. Сёння дзейнічае звыш 160 дамоў з расійскімі ўстановамі адукацыі і навукі, што складае 30% ад агульнай колькасці наяўных у ВНУ дамоў. З больш як 4000 замежных студэнтаў, што навучаюцца ў БДУ, звыш 800 расіян. Рэалізуюцца пагадненні аб правядзенні сумесных адукацыйных праграм з МДУ імя М. В. Ламаносава і РУДН. На долю Расіі прыпадае больш за палову аб'ёму экспартных паставак навукова-тэхнічнай прадукцыі БДУ. У асартыменце прадукцыі, якая пастаўляецца, навуковыя прыборы, абсталяванне, новыя рэчывы і матэрыялы, створаныя навуковым калектывам універсітэта.

Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі праходзіў з 26 па 28 чэрвеня. Ён сабраў звыш трох тысяч удзельнікаў. Сёлета тэмай мерапрыемства стала «10-годдзе Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі: вынікі і перспектывы». Арганізатары форуму – Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савет Федэрацыі Федэральнага Сходу Расіі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

### ПРЫЗНАЧЭННІ



**Дэканам факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі ІДА БДУ прызначаны Уладзімір Віктаравіч МАХНАЧ.**

Прадстаўленне новага кіраўніка факультэта адбылося 30 чэрвеня на Савеце ВНУ. Рэктар БДУ Андрэй Кароль пажадаў Уладзіміру Махначу поспехаў, плённай працы і дасягнення вызначаных мэт на карысць факультэта і ўніверсітэта.

**Даведка:**

Махнач Уладзімір Віктаравіч нарадзіўся ў Мінску ў 1987 годзе. У 2010 годзе скончыў геаграфічны факультэт БДУ па спецыяльнасці «геаграфія (навукова-педагагічная дзейнасць)», у 2014 годзе – аспірантуру з прысваеннем кваліфікацыі «даследчык». У БДУ працуе з 2010 года на пасадах асістэнта, старшага выкладчыка, намесніка дэкана па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ.

Галіна навуковых інтарэсаў уключае стратыграфію, палеанталогію, эвалюцыйную геаграфію і рэгіянальную фізічную геаграфію.

З'яўляецца аўтарам звыш 60 навуковых публікацый, у тым ліку навучальных і навучальна-метадычных дапаможнікаў, артыкулаў у рэцэнзаваных навуковых выданнях, часопісах базы даных Scopus. Выступаў з навуковымі дакладамі на міжнародных канферэнцыях у Германіі, Нідэрландах, Славакіі, Расіі і Францыі. Распрацоўшчык шэрагу навучальных праграм і НМК (ЭНМК) па дысцыплінах «Палеагеаграфія», «Гістарычная геалогія», «Эканоміка і геаграфія краін Блізкага Усходу і Афрыкі», «Геабатанічная практыка», «Біяразнастайнасць геасістэм і метады біяіндыкацыі», «Геабатанічнае картаграфаванне» і інш. Удзельнік навукова-папулярных фільмаў і праектаў па геалогіі і інш. Выступае ў рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ па пытаннях геалогіі, геаграфіі і турызму.

Член РГА «Белая Русь» і ГА «Беларускае геаграфічнае грамадства». Надае вялікую ўвагу працы са школьнікамі пры падрыхтоўцы іх да ўдзелу ў міжнародных алімпіядах па геаграфіі рознага ўзроўню са значнымі вынікамі. Яго выхаванцы заваявалі 2 сярэбраныя і 6 бронзавых медалёў на 7-й Еўрапейскай геаграфічнай алімпіядзе, 1 золата на 17-й Міжнароднай алімпіядзе па геаграфіі ў 2021 годзе.

З 2012 года з'яўляецца кіраўніком палеанталагічнага аддзела музея землязнаўства БДУ, прадстаўнік Беларусі ў асацыяцыі музеяў еўразійскіх універсітэтаў.

Узнагароджаны граматай БДУ (2019 г.) і Граматай Міністэрства адукацыі Беларусі (2020 г.). Мае падзяку БДУ (2013 г.), Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі (2019 г.). У 2022 годзе быў занесены на Дошку гонару работнікаў БДУ.

УНІВЕРСІТЭТ
18 ліпеня 2023 года, № 7 (2272)

# На грант спадзявайся, але і сам старайся

**Ці ведаеце вы, колькі чалавек у Беларусі займаюцца навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі? Як кажуць, лічбы ў студыю: паводле даных Нацыянальнага статыстычнага камітэта, такіх у нашай краіне каля 25 тысяч, а 21,8% ад гэтай колькасці – маладыя людзі ва ўзросце да 29 гадоў. Пра падтрымку моладзі ў нашым універсітэце мы вырашылі спытаць даследчыка, які не па чутках ведае пра гранты, – старшыню савета маладых навукоўцаў БДУ Настассю КІСЯЛЕВІЧ.**



*Кісялевіч Настасся Ігараўна – выкладчык кафедры міжнародных эканамічных адносін ФМА БДУ, старшыня савета маладых навукоўцаў БДУ, старшыня савета маладых навукоўцаў пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь.*

***– У 2020 годзе Вы атрымлівалі стыпендыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аспірантам. Якімі даследаваннямі тады займаліся і як выбралі тэму?***

– Тэма маіх даследаванняў – рэгіянальныя мадэлі камерцыялізацыі інавацый у сусветнай эканоміцы. Гэтай тэмай я займаюся з 2017 года, з моманту паступлення ў аспірантуру, але і на сённяшні дзень яна застаецца досыць актуальнай. Выбар быў зроблены зыходзячы з прыярытэтных напрамкаў развіцця навукова-тэхнічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь на 2016–2020 гады і ўласнай сферы інтарэсаў. Больш за тое, пераход на інавацыйны шлях развіцця, павышэнне эфектыўнасці камерцыялізацыі інавацый – гэта стратэгічныя мэты доўгатэрміновага ўстойлівага развіцця нашай краіны.

Вядома, вялікая роля ў выбары тэмы належыць навуковаму кіраўніку, кансультантам, якія аказвалі падтрымку ў працэсе напісання працы. Маім навуковым кіраўніком з'яўляецца Данільчанка Аляксей Васільевіч, дэкан факультэта менеджменту, маркетынгу і прадпрымальніцтва БНТУ, доктар эканамічных навук, прафесар. Доўгі час ён працаваў у БДУ і ўзначальваў кафедру міжнародных эканамічных адносін, дзе і я зараз выкладаю.

***– Для абароны дысертацыі Вы былі ўшанаваны гранта рэктара БДУ. Ці была гэтая падтрымка для Вас неабходная? На Ваш погляд, складаныя патрабаванні, тэрміны, умовы атрымання такога гранта?***

– Грант рэктара БДУ – гэта конкурс на атрыманне фінансавай падтрымкі для падрыхтоўкі і абароны кандыдацкай або доктарскай дысертацыі. Патрабаванні для ўдзелу сур'ёзныя, але пры ўмове паспяховага напісання дысертацыі падача заяўкі не ўяўляе складанасцяў. Конкурс праходзіць у 2 асноўныя этапы: завочны (запаўненне, збор і падача неабходных дакументаў) і вочны (пасяджэнне конкурснай камісіі, падчас якога ўсе кандыдаты прадстаўляюць свае заяўкі). Затым ужо прымаецца рашэнне аб вылучэнні гранта. Конкурс праводзяць у студзені-сакавіку кожнага года. Пры абароне кандыдацкай дысертацыі грант выдаецца на 2 гады, доктарскай – на тры. Для мяне грант стаў добрай фінансавай падтрымкай на этапе абароны дысертацыі.

За кошт гранта навукоўцы могуць пакрыць выдаткі на ўдзел у канферэнцыях, кангрэсах, сімпозіумах, у тым ліку за мяжой, публікацыю вынікаў даследаванняў, набыццё неабходнага абсталявання і расходных матэрыялаў. Кожны кандыдат самастойна пры падачы дакументаў вызначае патрэбныя выдаткі. Сродкамі, выдзеленымі ў рамках гранта, можна карыстацца да моманту абароны дысертацыі. Каб мець больш шанцаў на поспех, падаваць заяўку на грант варта ўжо пры наяўнасці значнай ступені падрыхтаванасці дысертацыі і пры гатоўнасці выйсці на этап яе папярэдняй экспертызы.

***– Вы дасканала валодаеце англійскай мовай? Ці чытаеце курсы на ёй?***

– Так, англійскай мовай я валодаю дасканала. Гімназія №6 у г. Маладзечна, у якой я вучылася, была з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы. З восьмага класа я ўдзельнічала ў алімпіядах па англійскай мове, у рэспубліканскім конкурсе работ даследчага характару, канферэнцыях. Пераможцай гэтага конкурсу была ў 2011 годзе. Ва ўніверсітэце таксама вывучала англійскую мову на паглыбленым узроўні.

На англійскай мове я чытаю шэраг дысцыплін: на ФМА – вяду практычныя заняткі па мікраэканоміцы; на эканамічным факультэце – практычныя заняткі па венчурным бізнесе; у Інстытуце бізнесу БДУ – лекцыі і практычныя заняткі па рэгіянальнай і нацыянальнай эканоміцы Беларусі, мікраэканоміцы.

***– Раскажыце, калі ласка, пра вопыт куратарства: цяжкасці, назіранні, поспехі…***

– З'яўляюся куратарам ужо 3 гады. З цяжкасцямі асабліва і не сутыкалася, паколькі адразу пасля таго, як стала куратарам, прайшла курсы павышэння кваліфікацыі ў БДУ і атрымала ўсе неабходныя веды.

Што тычыцца вопыту, то ён вельмі цікавы: бачыш, як студэнты з тваёй групы прыходзяць ва ўніверсітэт са здзіўленымі вачыма, дапамагаеш ім асвоіцца ва ўніверсітэцкім асяроддзі, праходзіш з імі разам іх сталенне і станаўленне як спецыялістаў. Студэнты пастаянна звярталіся і звяртаюцца да мяне па дапамогу: хтосьці па пытаннях напісання курсавых або праходжання практыкі, але большасць цікавіцца магчымасцямі для заняткаў навукай і ўдзелам у грамадскай дзейнасці ўніверсітэта.

Быць куратарам – адказная праца. Важна зразумець, які клімат і ўзаемаадносіны склаліся паміж вучнямі ў групе, ці няма ў іх праблем з паспяховасцю. Вельмі ганаруся кожным з іх і з задавальненнем у канцы семестра адпраўляю падзячныя лісты бацькам. Са студэнтамі знаходзімся на сувязі пастаянна. Для мяне важна, каб яны маглі звярнуцца да мяне ў любы час і з любым пытаннем.

***– У 2021 годзе Вы навучаліся на праграме цьютарскага суправаджэння студэнтаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі. Такі досвед сапраўды быў карысным?***

– Гэтая праграма дала разуменне таго, што важна выбудаваць траекторыю індывідуальнай працы з кожным студэнтам, зыходзячы з яго магчымасцяў, інтарэсаў і чаканняў ад навучання ва ўніверсітэце. Напрыклад, хтосьці гатовы займацца навуковай дзейнасцю з 1 курса, тады важна гэтую цікавасць падтрымаць і развіць. Іншым патрэбная дапамога з самадысцыплінай і тайм-менеджментам – з такім студэнтам мы стараемся разам вызначыцца з графікам выканання розных заданняў. У аснове індывідуальнасць кожнага. Але таксама важны і выбар розных падыходаў у навучанні. Вядома, мы стараемся выкарыстоўваць эўрыстычны падыход, калі ён падыходзіць. Роля цьютара – вызначыць, як працаваць са студэнтам і выбудаваць дарожную карту яго навучання на працягу 4 гадоў. Магу сказаць, што гэтая сістэма паспяхова працуе.

***– Колькі ў БДУ маладых навукоўцаў? Як Вы лічыце, мала іх ці дастаткова?***

– У БДУ больш за тысячу маладых навукоўцаў, не лічачы магістрантаў, якіх больш за 1,5 тысячы. Мяркую, што гэта колькасць павінна павялічвацца, асабліва ў частцы аступенянасці. Для гэтага сёння ў дзяржаве – і ў БДУ ў прыватнасці – створаны ўсе ўмовы. І мы бачым станоўчую дынаміку. Дзейнасць савета маладых навукоўцаў БДУ накіравана не толькі на падтрымку тых, хто ўжо мае навуковую ступень, але і ўвогуле на павелічэнне колькасці маладых навукоўцаў ва ўніверсітэце.

***– Як старшыні савета Вам удалося вырашыць пэўныя праблемы, ажыццявіць каштоўныя для маладых навукоўцаў праекты?***

– Савет маладых навукоўцаў БДУ – калегіяльны дарадчы грамадскі орган, дзейнасць якога накіравана на вырашэнне пытанняў моладзевай палітыкі ўніверсітэцкага ўзроўню ў навуковай, адукацыйнай і сацыяльнай сферах. Савет працуе над узмацненнем ролі маладых навукоўцаў у вырашэнні навукова-адукацыйных, даследчых, тэхнічных, інавацыйных, сацыяльных і іншых актуальных задач БДУ. Таксама мы працуем у іншых кірунках: прафарыентацыйная работа са школьнікамі, арганізацыя і правядзенне навучальных інтэнсіваў, семінараў. Мы актыўна ўзаемадзейнічаем з грамадскімі аб'яднаннямі ўніверсітэта, напрыклад, студэнцкім саветам, ССЯАН, прафкамам студэнтаў.

Сярод найбольш значных мерапрыемстваў за апошні час можна адзначыць серыю навучальных інтэнсіваў, у рамках якой прайшлі семінары, прысвечаныя публікацыйнай актыўнасці, выкарыстанню сістэмы «Антыплагіят», грантавай падтрымцы маладых навукоўцаў, прэзентацыі даследаванняў і інш.

Савет прымае актыўны ўдзел у фестывалі навукі, форуме маладых навукоўцаў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь, у міжнародных форумах. У верасні 2022 г. у супрацоўніцтве з ССЯАН мы правялі стажыроўку для студэнцкага навуковага таварыства Кубанскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта імя І. Ц. Трубіліна, у лістападзе 2022 г. – тыдзень студэнцкай навукі «Academy of scientific qualities». У новым навучальным годзе запланавана яшчэ больш мерапрыемстваў, уключаючы школу маладога навукоўца.

***– Хто для вас галоўны арыенцір у свеце даследаванняў? Магчыма, у Вашай сям'і ёсць навукоўцы, акрамя Вас?***

– Не, у маёй сям'і няма навукоўцаў, выкладчыкаў ці настаўнікаў. Я арыентуюся на вядучых беларускіх даследчыкаў-эканамістаў, паколькі маё даследаванне з галіны эканамічных навук. Сярод іх магу назваць старшыню прэзідыума НАН Гусакова Уладзіміра Рыгоравіча, дырэктара БРФФД Дайнеку Аляксея Яўгенавіча, прафесара БДУ Кавалёва Міхаіла Міхайлавіча. Таксама арыенцірамі для мяне з'яўляюцца мой навуковы кіраўнік і калегі. Сфера маіх навуковых інтарэсаў – праблемы развіцця сусветнай эканомікі і міжнародных эканамічных адносін, інавацыйнае развіццё, камерцыялізацыя інавацый.

**Дар'я ПАЎЛЮЧУК**



*Каманда маладых навукоўцаў-гульцоў «Што? Дзе? Калі?»*

Сярод аспірантаў, якім былі прызначаны стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 2023 год, 10 прадстаўнікоў БДУ.
Стыпендыі Прэзідэнта таленавітым маладым навукоўцам атрымалі 10 супрацоўнікаў універсітэта.
На дадзены момант гранты рэктара БДУ рэалізуюць 9 навукоўцаў.

# Ліпеньская спякота прыёмнай кампаніі

**Усярэдзіне лета паветра награваецца не толькі на вуліцы: становіцца вельмі «гарачай» тэлефонная лінія прыёмнай камісіі ўніверсітэта, у акаўнты БДУ ў сацыяльных сетках прылятаюць пытанні абітурыентаў, студэнтаў і іх бацькоў. Самыя часта задаваныя – якія дакументы, калі і куды несці. Удакладняюць таксама, якія асаблівасці паступлення ў гэтым годзе. На некаторыя пытанні ў рамках праекта «Кропкі над ё» адказвае прарэктар па вучэбнай працы і інтэрнацыяналізацыі адукацыі, намеснік старшыні прыёмнай камісіі БДУ – 2023 Канстанцін Уладзіміравіч КАЗАДАЕЎ.**



– Прыёмная кампанія ў гэтым годзе выдалася вельмі няпростая. Хоць для ўніверсітэта і абітурыентаў пачалася яна задоўга да ліпеньскіх мерапрыемстваў – у студзені, калі мы праводзілі ўпершыню ў гісторыі краіны рэпетыцыю цэнтралізаванага экзамену (ЦЭ), а ў красавіку – рэгістрацыю на яго. У маі былі вельмі напружаныя для ўніверсітэта дні, паколькі даты правядзення ЦЭ супалі з сеткай заняткаў ва ўніверсітэце і залікамі.

Потым, напачатку чэрвеня, неўзаметку для студэнтаў, але вельмі працаёмка для кіраўніцтва і выкладчыкаў, прайшла кампанія па прыёме на мэтавую форму навучання. У другой палове чэрвеня мы плаўна «перацяклі» ва ўжо звыклую форму выпрабавання – цэнтралізаванае тэсціраванне (ЦТ). І вось падабраліся да другой паловы ліпеня: гатовыя прымаць дакументы на асноўную прыёмную кампанію, якая і пакажа, як мы адпрацавалі ўвесь гэты год.

Графік прыёму дакументаў сёлета даволі добра збалансаваны. *Пачынаецца падача 17 ліпеня, а 25 ліпеня заканчваецца прыём дакументаў на бюджэтную форму атрымання адукацыі.*

Пры гэтым вельмі ўдала, што і першыя, і апошнія дні не трапляюць у выхадныя. Паколькі ў выхадны дзень вельмі цяжка ўзяць медыцынскую даведку, ці даведку з месца працы, ці нейкі дакумент памяняць.

*З 26 ліпеня па 2 жніўня мы будзем праводзіць унутраныя выпрабаванні на тых факультэтах, дзе яны прадугледжаны.*

Дакументы на платную форму мы прымаем да 9 ліпеня. Ужо з 4 жніўня пачнём залічаць бюджэтнікаў, на платную форму залічэнне завершыцца да 11 жніўня. Такім чынам, асноўныя мерапрыемствы па прыёме і залічэнні ў студэнты першага курса запланаваны да сярэдзіны жніўня.

### Як могуць быць залічаны ў БДУ замежныя грамадзяне?

– Ёсць некалькі магчымых спосабаў паўдзельнічаць у конкурсе на залічэнне ў БДУ для замежных абітурыентаў.

Выпускнікі навучальных устаноў Расіі і іншых краін ЕАЭС, па-першае, могуць прэтэндаваць на грант Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Гэта прадугледжана міжурадавымі дамовамі, калі ёсць зацікаўленасць дзвюх краін у падрыхтоўцы кадраў для краіны заяўніка.

Па-другое, калі абітурыент здаў ЦТ у Беларусі, ён можа ўдзельнічаць у конкурсе нароўні з выпускнікамі беларускіх навучальных устаноў і ў такім разе мае тыя ж правы пры паступленні на любую форму атрымання адукацыі.

Па-трэцяе, калі абітурыент не здаваў ЦТ, але здаў АДЭ, то ў гэтым годзе прадстаўлены ўнікальныя льготы: ён можа прэтэндаваць на залічэнне на платныя месцы пры ўмове, што профільныя выпрабаванні АДЭ супадаюць з профільнымі выпрабаваннямі на дадзеныя спецыяльнасці. Такіх месцаў запланавана не больш за 20% ад лічбаў прыёму на платную форму адукацыі. Удакладню, што ў дадзеным выпадку гаворка не пра колькасць балаў. Проста такія сертыфікаты АДЭ ў абітурыента павінны быць. І калі прэтэндэнтаў набіраецца не больш за 20%, то залічаем іх усіх, без дадатковага конкурсу. Але калі такіх студэнтаў, якія вырашылі паступаць на льготныя месцы па выніках АДЭ, больш за 20%, то праводзіцца конкурс: адбываецца ранжыраванне балаў, улічваюцца дасягненні і г. д. Тое ж самае адбываецца ва ўсіх выпадках, калі колькасць прэтэндэнтаў на льготныя месцы перавышае вызначаны ліміт.

### Як наладжана зваротная сувязь з абітурыентамі, ці ёсць чат-бот?

– Безумоўна, такая форма інтэрактыву ёсць. На пытанні мы будзем вельмі рады адказаць. Разгорнутую інфармацыю пра прахадныя балы, пра структуру нашых факультэтаў, спецыяльнасці, парадак прыёму на іх можна атрымаць з дзяржаўных СМІ, на нашым сайце abiturient.bsu.by. Можна шмат цікавай інфармацыі пра факультэты атрымаць у дэканаў факультэтаў і іх намеснікаў, задаць ім пытанні.

### Які механізм пераходу на іншую спецыяльнасць або факультэт? Ці можна перайсці з платнай формы навучання на бюджэтную?

– Магчымасць такая існуе. Праўда, каб прадухіліць масавыя скачкі, хачу адзначыць: яна спалучана з вялікай колькасцю «але».

Трэба ўлічваць некалькі фактараў. Па-першае, каб мець магчымасць перавесціся на іншы факультэт ці спецыяльнасць, павінны быць вольныя месцы на патрэбнай форме навучання. Гэта значыць хтосьці павінен гэтыя месцы вызваліць па выніках сесіі ці яшчэ нейкіх прычынах. Выкажам здагадку, што для студэнта знайшлося ўсё-такі месца і ёсць магчымасць пераводу, рэгламентаваная нашай нарматыўнай базай. Трэба разумець яшчэ сёе-тое: чым далейшыя спецыяльнасці адна ад адной, тым больш акадэмічнай розніцы. І ліквідацыя гэтай розніцы звычайна павінна быць праведзена ў досыць кароткія тэрміны – не больш за месяц. Таму трэба быць гатовым да таго, што ўсё назапашанае за першы год навучання, усе залікі, іспыты трэба будзе здаваць у аўральным парадку. Гэта неабходная ўмова для таго, каб перавесціся. Так што калі нейкі іспыт вы не здасце, то ні пра які перавод размовы ісці не будзе. Як правіла, усе пераводы робяцца ў нас у вакацыйны час.

Пры пераходзе з платнай формы на бюджэтную таксама неабходна ўлічваць наяўнасць бюджэтных месцаў. У БДУ перыядычна ажыццяўляюцца такія пераходы. Напрыклад, калі ў студэнта вельмі высокая паспяховасць, ён таленавіты і выяўляе сябе ў навуковай дзейнасці ці ў грамадскім жыцці ВНУ. А бываюць выпадкі, калі ў добрага студэнта ўзнікаюць цяжкасці па розных сацыяльна-бытавых прычынах, напрыклад, пагаршаюцца матэрыяльныя ўмовы. Вядома, такім маладым людзям вельмі хочацца дапамагчы.

### На Ваш погляд, трэба ўкараняць больш праграм на замежнай мове?

– Трэба. Прычым і на першай ступені, і на другой. Каб узмацняць інтэрнацыяналізацыю нашай ВНУ, павялічваць яе прывабнасць для замежных студэнтаў і абітурыентаў.

### На якіх факультэтах звычайна складаецца самы вялікі конкурс?

– Спіс лідараў традыцыйна не змяняецца: факультэт міжнародных адносін, факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, эканамічны, біялагічны факультэты і факультэт журналістыкі.

**Пытанні задавалі студэнты БДУ**
**Аляксей ТУМАРКІН і Яніна КЛІМОВІЧ**




*Відэа глядзіце на youtube.com @videoBSU*

# Як валанцёры БДУ рыхтуюцца да ІІ Гульняў краін СНД?

**ІІ Гульні краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў адбудуцца ў Беларусі з 4 па 14 жніўня. Спаборніцтвы пройдуць па ўсёй краіне: турніры ў 20 відах спорту прымуць 11 гарадоў. Працу валанцёраў у сталіцы арганізоўвае і БДУ.**

Ва ўніверсітэце наборам валанцёраў для гульняў займаецца ўпраўленне па выхаваўчай рабоце з моладдзю. Начальнік аддзела маладзёжных праграм і праектаў УВРМ **Антон Купчын** распавёў, колькі студэнтаў падалі заяўку і якія «прывілеі» ў іх будуць.

– У якасці валанцёраў у гульнях будзе задзейнічана 30 студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на многіх відах спорту. У комплексе Palova Arena пройдзе турнір па баскетболе 3х3. Гэта асноўная пляцоўка, на якой будуць працаваць нашы студэнты. Для таго, каб стаць валанцёрам Другіх гульняў краін СНД, яны яшчэ ў лютым падавалі заяўку ў Рэспубліканскі валанцёрскі цэнтр. Усяго ад БДУ было пададзена каля 60 заявак. Арганізатары гульняў у завочным фармаце вызначылі кандыдатаў, улічваўся іх вопыт валанцёрскай дзейнасці, навыкі і кампетэнцыі, названыя ў анкеце. У чэрвені валанцёры прайшлі навучанне: з 1 па 15 чэрвеня працавалі падчас правядзення трэніровачных гульняў для зладжвання розных службаў і размеркавання іх функцыяналу. Валанцёрам, якія прымаюць удзел у арганізацыі ІІ Гульняў краін СНД, будзе прапанаваны інтэрнат на час правядзення спаборніцтваў, харчаванне, бясплатны праезд у грамадскім транспарце, магчымасць наведвання мерапрыемстваў гульняў. Вядома ж, яны набудуць новыя знаёмствы і эмоцыі ад удзелу ў маштабным спартыўным мерапрыемстве, – адзначае супрацоўнік УВРМ.




*belarus2023games.by*

Па выніках нашага апытання, пераважная большасць валанцёраў ад БДУ – дзяўчаты. Многія добраахвотнікі мінчане, але таксама ёсць жыхары Крычава, Лунінца, Горак і іншых невялікіх гарадоў Беларусі, што гаворыць пра шырокую геаграфію зацікаўленых студэнтаў. У асноўным стаць памочнікамі на спаборніцтвах выказалі жаданне студэнты другога курса. Большая частка – навучэнцы факультэта міжнародных адносін.

Каля 60% валанцёраў адзначылі, што прафесійна спортам не займаюцца, але вядуць актыўны лад жыцця. Іншыя рэспандэнты адказалі, што займаюцца спортам толькі ў вольны час, а некаторыя і зусім вядуць малаактыўны лад жыцця. Важна адзначыць, што ёсць сярод студэнтаў і тыя, хто займаецца спортам у секцыях БДУ.

На пытанне, чаму вырашылі стаць добраахвотнікам, многія адказалі проста: мерапрыемства выклікала вялікую цікавасць, таму што дае шанец дакрануцца, як праходзяць спаборніцтвы міжнароднага маштабу знутры. Некаторыя студэнты бачаць у такой дзейнасці своеасаблівую крыніцу жыццёвых сіл і новых знаёмстваў.

– Валанцёрства – гэта выдатная магчымасць весела і прадуктыўна правесці лета, пазнаёміцца з актыўнай моладдзю, набыць неверагодны вопыт. У цэлым, прыняць удзел у такой маштабнай спартыўнай падзеі – вялікі гонар для мяне і, можна сказаць, мара, якая вось-вось споўніцца, – адказала студэнтка ФПМІ з Горак.

Спаборніцтвы ў Беларусі пройдуць па 20 відах спорту: лёгкая атлетыка, валейбол, мастацкая гімнастыка, кулявая стральба, пляжны футбол, сучаснае пяцібор'е, баскетбол 3х3, міні-футбол, грэка-рымская, вольная, жаночая барацьба, пляжны валейбол, гандбол, плаванне, тайландскі бокс, бокс, дзюдо, самба, хакей на траве, цяжкая атлетыка, стральба з лука, каратэ. У большасці з іх за медалі пазмагаюцца моладзь і юніёры – найбліжэйшы рэзерв зборных.

Дзякуючы адкрытаму фармату Гульняў, іх удзельнікамі могуць стаць прадстаўнікі краін, што не ўваходзяць у СНД. Таму ў Беларусь прыбудуць спартсмены з Манголіі, Кітая, Кубы, Ірана, Амана, Саудаўскай Аравіі і іншых дзяржаў.

Нагадаем, што ўпершыню Гульні краін СНД прайшлі ў 2021 годзе, у Казані (РФ). Больш за 1100 спартсменаў з 9 краін Садружнасці з'ехаліся ў сталіцу Татарстана. У жніўні 2023 года ў Беларусі чакаецца больш удзельнікаў з-за новага адкрытага фармату спаборніцтваў.

Талісманам гэтых гульняў стала самабытная беларуская рысь «Рыся». Яе намалявала беларуская мастачка Алёна Кіш. Лагатыпам спаборніцтваў стала васьміканцовая зорка, якая раскрываецца ў яркі дынамічны васілёк. Гэтая кветка – адзін з неафіцыйных сімвалаў Беларусі. Да васілька былі дададзеныя пялёсткі ў колерах алімпійскіх кольцаў, што кажа пра падтрымку арганізатарамі Гульняў алімпійскіх прынцыпаў і традыцый.

Прэс-канферэнцыя, на якой былі прадстаўлены медалі, цацка-талісман і экіпіроўка для спартсменаў і персаналу (валанцёраў, медперсаналу і прадстаўнікоў допінг-кантролю), адбылася 5 ліпеня ў ратушы горада Мінска.

Уваход на ўсе спаборніцтвы – бясплатны.

**Ілья ВАРАБ'ЁЎ**

УНІВЕРСІТЭТ
18 ліпеня 2023 года, № 7 (2272)

# Вышэйшая адукацыя з ухілам

## Палявая практыка студэнтаў факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі

**Студэнты 1 і 2 курсаў факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі напрыканцы навучальнага года выязджаюць на геастанцыю «Заходняя Бярэзіна» для праходжання палявых практык. Пасля трэцяга курса іх накіроўваюць на вытворчыя практыкі.**

Геастанцыя стаіць у асяроддзі лясоў у Валожынскім раёне. Наваколле прасякнута рознымі гукамі: гудзеннем насякомых, шумам дрэў, птушынымі спевамі. Непадалёк – Рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Налібоцкі». Цікава, што побач са станцыяй пры дапамозе лазернага сканера, усталяванага на беспілотным лятальным апараце, супрацоўнікі БДУ выявілі гарадзішча прыкладна X стагоддзя!

Каля варот бачым першую выдатнасць – камень з надпісам пра вучэбную геаграфічную станцыю БДУ. Тут, ля каменя, нас сустракае праваднік – старшы выкладчык кафедры глебазнаўства і геаінфармацыйных сістэм **Аляксей Сазонаў.**

Па сцежцы, выкладзенай для зручнасці спартыўнымі матамі, накіроўваемся да аднапавярховага доміка. Тутэйшыя называюць яго «камералкай». Цікаўлюся, адкуль такая назва. Аказваецца, у гэтым будынку размешчаны невялікія навучальныя пакоі для самастойнай працы студэнтаў пасля збору даных на палявым этапе практыкі. Наш праваднік тлумачыць, што практыка дзеліцца на два этапы – палявы і камеральны. У мясцовым студэнцкім інтэрнаце таксама ёсць пакоі для самападрыхтоўкі, дзе навучэнцы займаюцца аналізам сабраных даных, пабудовай мадэляў і стварэннем карт, а таксама пішуць справаздачы па практыцы.

Усяго на тэрыторыі станцыі некалькі аднапавярховых будынкаў для супрацоўнікаў і адміністрацыі, двухпавярховы інтэрнат, сталовая, лазня, клуб і санітарны блок. Падчас практыкі на станцыі жывуць каля 100 навучэнцаў і 20 выкладчыкаў.

Студэнты і выкладчыкі жывуць па дакладным працоўным графіку: пад'ём у 7.00, зарадка, лінейка (на ёй агучваюць агульныя навіны і заняткі на дзень), потым сняданак. З 9 да 13 гадзін групы разыходзяцца на заняткі, потым вяртаюцца на абед і адпачынак, а з 15 да 18 гадзін зноў ідуць «у поле». Па вечарах і ў нядзелю студэнты займаюцца самападрыхтоўкай і бавяць сумесны вольны час – футбол, баскетбол, розныя гульні на адкрытым паветры, іншы раз і дыскатэка.

Каля 20 дзён навучэнцы жывуць на станцыі, з імі праводзяць практычныя заняткі па розных дысцыплінах. Пры гэтым групы падзеленыя на брыгады да 10 чалавек. Першакурснікі абавязкова праходзяць практыку па глебазнаўстве, метэаралогіі, геалогіі, геабатаніцы і тапаграфіі. А для другакурснікаў прадугледжаны гідралагічная, геамарфалагічная і вузкаспецыяльныя практыкі (якія адпавядаюць напрамку дзейнасці іх кафедры). Мы трапілі на станцыю якраз падчас практыкі студэнтаў другога курса.

Для спецыяльнасцяў «геаграфія» і «турызм і экскурсійная дзейнасць» на станцыі праходзіць комплексная эканоміка-геаграфічная, комплексная фізіка-геаграфічная і краязнаўчая вучэбна-азнаямляльная практыкі. Для спецыяльнасці «геаэкалогія» – геаэколага-эканамічная, ландшафтна-экалагічная і геаэколага-тэхналагічная вучэбна-азнаямляльная практыкі. Для студэнтаў спецыяльнасці «гідраметэаралогія» – лімналагічная, мікракліматычная і аграметэаралагічная практыкі, а для будучых спецыялістаў па геаінфармацыйных сістэмах – землеўпарадкавальная і геаінфармацыйна-геадэзічная. Для спецыяльнасці «касмааэракартаграфія і геадэзія» арганізаваныя заняткі па дэшыфраванні аэракасмічных здымкаў і геадэзічная практыка.

### МІКРАКЛІМАТЫЧНАЯ ПРАКТЫКА

Другакурснікі спецыяльнасці «гідраметэаралогія» на працягу 4 дзён вядуць назіранні за надвор'ем, мікракліматам, складаюць метэаралагічныя зводкі, прагназуюць стан надвор'я. На адкрытай пляцоўцы яны замерваюць тэмпературу паветра, глебы, узровень вільготнасці, кірунак ветру, аб'ём ападкаў.



1



2



Калі мы зазірнулі на пляцоўку да студэнтаў, адразу звярнулі ўвагу на шкляны шар, які так ярка свеціцца ў сонечны дзень. Гэта незвычайны прыбор – *геліёграф*. У невялікае прыстасаванне ўкладаюць спецыяльную стужку, шкляны шар стварае эфект павелічальнага шкла і выпальвае на стужцы лінію. Так замерваюць працягласць сонечнага ззяння на працягу дня.

### ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАЛЬНАЯ ПРАКТЫКА

Гэтая практыка адна з самых аб'ёмных па колькасці заняткаў і даследаванняў, доўжыцца 8 дзён. Другакурснікі спецыяльнасці «геаінфармацыйныя сістэмы (зямельна-кадастравыя)» Максім Бірукоў і Цімур Сямёнаў прадэманстравалі нам прыборы, з дапамогай якіх яны праводзяць тапаграфічную здымку і складаюць план мясцовасці. Напрыклад, адно з такіх тэхнічных прыстасаванняў перадае GPS-каардынаты. Не дзіва, што сучасны спецыяліст даволі хутка можа алічбаваць поле ці зямельны ўчастак – адзначаныя па перыметры ў розных кропках каардынаты ён апрацоўвае на камп'ютары і стварае па гэтых даных тапаплан.

Паглядзелі, як Аляксей Сазонаў праводзіць заняткі з дронам (фота №2). Спачатку выкладчык вызначыў пляцоўку для запуску маленькага лятальнага апарата. Праз некалькі хвілін на экране планшэта ўбачылі прыгожыя навакольныя лясы, выгібы ракі Заходняя Бярэзіна і з вышыні птушынага палёту паглядзелі на саму геастанцыю. Канешне, БПЛА ў працы спецыяліста па геаінфармацыйных сістэмах выкарыстоўваюцца не для такіх рамантычных мэтаў. Аэрафотаздымку прымяняюць у землеўпарадкаванні, напрыклад, для ўсталявання мяжаў зямельнага ўчастка ці для здымкі рэльефу.

*«Гэта ваш чмель гудзе?»* – жартуе выкладчык іншай групы, праходзячы міма «ГІСаўцаў».

### ГЕАМАРФАЛАГІЧНЫЯ ПРАКТЫКА

Услед за групай студэнтаў накіроўваемся па лясной сцежцы ўбок ад станцыі. Прыпынак – слухаем разам са студэнтамі выкладчыка: «Пясок, які назапашваецца ў вусцях яроў і ў лагчынах сцёкаў, як называецца з пункту гледжання генезісу?» На тварах студэнтаў задуменне. Асцярожны шэпт: «Алювій? Пралювій?» Выкладчык згаджаецца: «Пралювій. Зараз мы паглядзім, што ён сабой уяўляе. На глыбіню рыдлёўкі ўскапаем тут. Ну што, які гарызонт? Звярніце ўвагу, што для яго характэрная слаістасць: светлы пласт утвараецца ў летні час, цёмны – у асенне-зімовы перыяд, калі перагнівае расліннасць» (фота №1).

Кожны дзень «у полі» падчас такіх практык студэнты даследуюць геалагічныя адклады, іх заляганне і паходжанне, вывучаюць марфалагічныя, фізіка-хімічныя і аграхімічныя асаблівасці глеб, вызначаюць іх тыпы і разнавіднасці, складаюць глебавыя карты і даюць комплекснае апісанне глебавага покрыва. Працуюць у камандзе: хлопцы спраўляюцца з рыдлёўкай, трымаюць карты, дзяўчаты робяць фотаздымкі і запісваюць даныя.



*Аэрафотаздымак гідралагічнай практыкі на рацэ Заходняя Бярэзіна*

### ГІДРАЛАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА

Каб вывучаць гідралагічныя і марфаметрычныя асаблівасці ракі і вадасховішчаў, трэба быць смелым, бо прыйдзецца лезці ў ваду. Падчас такой практыкі студэнты за 4 дні вучацца карыстацца гідралагічнымі прыборамі і інструментамі, робяць назіранні: вымяраюць хуткасць цячэння, вызначаюць морфаметрычныя характарыстыкі ракі, на падставе якіх складаюць яе гідраграфічнае апісанне.

**Саўко Аляксандра, 2 курс, ГІС (зямельна-кадастравыя)**



– На маёй спецыяльнасці звычайна самы высокі прахадны бал. Чаму я яе абрала? Менавіта таму, што мне параіла школьная настаўніца геаграфіі – выпускніца геафака БДУ. Яна сказала, што ГІС уключае мноства кірункаў і ведаў, таму адкрывае больш варыянтаў пры працаўладкаванні. У нас сапраўды шмат практычнага досведу падчас навучання. Летнія практыкі дапамагаюць удакладніць агульнагеаграфічныя веды, якія мы ўжо атрымалі. Падчас заняткаў па землеўпарадкаванні мы вучымся працаваць з прыборамі. Мы і на парах глядзелі на гэтыя прыборы, ведаем іх назвы і прынцып дзеяння. Але, калі ты выходзіш працаваць з прыладай на практыцы, гэта значна цікавей, лепш разумееш сваю будучую справу!

**Цімур Сямёнаў, 2 курс, ГІС (зямельна-кадастравыя)**

– Па геаграфіі я набраў больш балаў на ЦТ, чым па іншых прадметах. Спрабаваў паступіць на ваенны факультэт на ГІС, але не прайшоў. Мне падказалі, што ёсць на геаграфічным факультэце месца на платнай форме навучання. Скажу шчыра, на першым курсе я быў такі разгублены: не разумеў, навошта мне ўсё гэта трэба, што буду рабіць з гэтымі ведамі, дзе змагу працаваць. Бо мне, платніку, самому прыйдзецца шукаць працоўнае месца пасля вучобы. Напрыканцы першага курса ў нас была палявая практыка, а яшчэ нас вадзілі па розных прадпрыемствах, дзе працуюць «ГІСы». Пасля гэтага я ўжо не адчуваў сябе такім «згубленым качанём».

**Яніна Дзялец, 2 курс, касмааэракартаграфія**



– Гэтая практыка вельмі душэўнае месца – так кажуць усе. Нашы выкладчыкі, якія тут самі калісьці былі на практыцы, адзначалі, што геастанцыя не толькі база для палявых вучэбных заняткаў. Цяпер я іх разумею. Гэта месца, дзе ты знаходзіш свае схільнасці і прызванне як прафесіянал, напрацоўваеш уменні і навыкі. Тут можна пасябраваць і несці гэтае сяброўства скрозь гады. Можна нават знайсці сваю палову: некаторыя выкладчыкі знайшлі сабе пару менавіта тут, падчас практыкі.

**Дар'я ПАЎЛЮЧУК**

# на практычны досвед

## Самая модная кафедра ўніверсітэта

**Кафедру дызайну моды ФСК БДУ па чалавечых мерках можна лічыць дзіцём – 1 верасня ёй споўніцца 6 гадоў. Але за гэты час ужо ёсць нямала дасягненняў, якімі яна можа ганарыцца. Пра праграмы, асаблівасці навучання і стварэнне аўтарскіх калекцый гутарым з загадчыцай падраздзялення Аленай Ігараўнай АТРАХОВІЧ.**

Кафедра дызайну моды ФСК у наступным навучальным годзе пачне працу па трох навучальных планах. Першы – праграма прафілізацыі «дызайн моды і аксесуараў», другі – па праграме адкрытага ў мінулым годзе напрамку «дызайн касцюма і тканін» (спецыяльнасць «дызайн»). У сёлетнюю прыёмную кампанію таксама абвешчана набор на новую спецыяльнасць «дызайн касцюма і тэкстылю». Дарэчы, паступіць на яе яшчэ да пачатку прыёму дакументаў выказала жаданне нямала абітурыентаў – яны завітвалі на дзень адчыненых дзвярэй, размаўлялі з выкладчыкамі, прыходзілі на абарону студэнцкіх работ і наведвалі падрыхтоўчыя курсы.



– Кафедра развіваецца, набірае моц. Такі рэжым – з'ява няпростая, але гэта творчы і цікавы працэс як для студэнтаў, так і для выкладчыкаў, – адзначае загадчыца.

Перад адкрыццём новых спецыяльнасцяў кафедра праводзіла даследаванні попыту. Супрацоўнікі аналізавалі ўласныя акадэмічныя магчымасці, маніторылі становішча прафесіі на рэспубліканскім рынку працы, кансультаваліся з прадпрыемствамі лёгкай прамысловасці, вывучалі заяўкі на падрыхтоўку спецыялістаў з падобнымі кампетэнцыямі. Інтэрпрэтацыя вынікаў гэтай работы і патлумачыла неабходнасць адкрыцця новых спецыяльнасцяў.

– Мы бачым, што нават у першыя гады прыёму на напрамкі кафедры фарміруюцца высокія конкурсы, цікавасць да прафесіі расце. І нашы выпускнікі добра размяркоўваюцца. Сярод арганізацый, дзе засталіся нашы выпускнікі, – Mark Formelle, атэлье LineA («Галоўнае гаспадарчае ўпраўленне» Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь), Нацыянальная школа прыгажосці і інш. Некаторыя выпускнікі адкрываюць майстэрні ці студыі, развіваючы ўласную справу, – дзеліцца Алена Ігараўна.

У дыпломе выпускніка кафедры на месцы кваліфікацыі будзе ўказана «дызайнер». Аднак выбар для занятасці ў іх будзе значна шырэйшы. Спецыялісты з такой адукацыяй змогуць працаваць стылістамі, мадэльерамі, дызайнерамі-канструктарамі, мноднымі фатографамі і інш. На такія кадры існуе вялізны попыт на рынку працы праз іх універсальнасць, паколькі яны спалучаюць кампетэнцыя розных спецыялістаў.



*Выпускніцы 2023 года (К. Касач, Г. Крывошык, П. Савук, З. Лук'яненка)*

Галоўная дысцыпліна, якую вывучаюць студэнты, называецца «дызайн-праектаванне» («мастацкае праектаванне»). Вакол яе групуюцца і іншыя прафесійныя прадметы – «касцюмаграфіка і фэшнфатаграфія», «матэрыялазнаўства», «канструяванне» (дзякуючы ім будучыя дызайнеры набываюць інструментарый візуалізацыі сваіх ідэй), «праца ў матэрыяле», «матэрыялазнаўства і канфекцыяніраванне». Таксама добраму спецыялісту нікуды без «гісторыі касцюма і моды» і «гісторыі мастацтваў». Акрамя таго, важнымі дысцыплінамі, на якіх грунтуецца прафесія сучаснага дызайнера, з'яўляюцца «акадэмічны малюнак», «акадэмічны жывапіс» і «інфармацыйныя тэхналогіі ў дызайне касцюма».

– Значны аб'ём вучэбнай праграмы займаюць «інфармацыйныя тэхналогіі ў дызайне касцюма». Спачатку студэнты вучацца працаваць у базавых праграмах – Photoshop ці CoralDrow, а затым пераходзяць на вузкапрофільныя дадаткі – для віртуальных прымерак і эскізаў. Гэта важна, таму што выпускнікі пачынаюць адразу ж працаваць з такімі праграмамі, калі прыходзяць на прадпрыемствы, – заўважае Алена Ігараўна. – Бясспрэчна, вучэбны працэс па спецыяльнасці кафедры носіць практыка-арыентаваны характар. Таму значная колькасць навыкаў дызайнера набываецца тады, калі студэнты працуюць рукамі. Колькі ні гавары, але шыць ты не навучышся, калі не возьмеш іголку і не пачнеш рабіць першыя швы. Зыходзячы з гэтага праграма пабудавана так, што ў ёй прысутнічаюць тэарэтычныя, практычныя і камбінаваныя дысцыпліны. У працэнтных суадносінах практыка займае каля 80% навучальнага працэсу.

Важную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў высокага ўзроўню адыгрывае студэнцкая практыка. Іх за перыяд навучання 4: вучэбная (1 курс), праектная (2 курс), вытворчая (3–4 курс) і пераддыпломная (5 курс). Падчас першай практыкі дызайнеры-пачаткоўцы робяць замалёўкі касцюмаў у Музеі старажытнай беларускай культуры НАН Беларусі, вывучаючы канструкцыю адзення і яго каларыстычныя рашэнні. Таксама іх чакае пленэр у Музеі народнай архітэктуры і побыту (вёска Строчыцы Мінскага раёна), дзе студэнты пазнаёмяцца з нацыянальнай культурай.

На другім курсе студэнты вывучаюць працу розных прадпрыемстваў. У канцы практыкі ім патрэбна напісаць справаздачу-аналіз па функцыянаванне прадпрыемства, а таксама зрабіць эскізы калекцыі, якую можна там пашыць. А за перыяд вытворчай і пераддыпломнай практыкі старшакурснікі распрацоўваюць і адшываюць мадэлі, камплекты ці калекцыі адзення на базе арганізацый-партнёраў.

За перыяд навучання працу дызайнера і вытворчае абсталяванне прамысловага прадпрыемства маладыя людзі вывучаюць з розных бакоў. Здараецца, студэнты трапляюць у швейныя майстэрні пры буйных установах культуры. Так, напрыклад, моладзь ужо паспела папрацаваць з майстрамі Вялікага тэатра оперы і балета і Беларускага дзяржаўнага цырка. Студэнты застаюцца ў захапленні ад такога вопыту, паколькі атрымліваюць ад майстроў шмат практычных парад. Выкладчыкі прызнаюцца, што, калі кафедра робіць запыты ў арганізацыі для супрацоўніцтва, адусюль прыходзіць станоўчы адказ. Так, ужо каторы год на практыку да сябе студэнтаў запрашаюць дызайн-цэнтр ААТ «Камволь», ААТ «Стыльмэн», трыкатажная фабрыка «Алеся» і інш. Невыпадкова першыя гады пасля выпуску Алена Атраховіч заўсёды рэкамендуе маладым людзям папрацаваць на вытворчасці: гэта дапамагае ім адточваць прафесійныя навыкі, рэалізоўваць творчыя задумы, а таксама вучыць разумець патрэбы спажыўца.

Убачыць першы плён сваёй працы студэнты кафедры могуць на прэзентацыях аўтарскіх калекцый на BSU Fashion Day, Рэспубліканскім фестывалі-конкурсе моды і фота «Млын моды», подыумах Нацыянальнай школы прыгажосці і інш. Адзін з самых запамінальных паказаў маладых дызайнераў – гэта, канешне, абарона іх дыпломных праектаў. Сёлета газета «Універсітэт» далучылася да гэтага мерапрыемства, дзе на «суд» камісіі было прадстаўлена 4 праекты.

Выпускніца Кацярына Косач прэзентавала калекцыю «O'Bras». У аснову творчай задумы лягло харасто нацыянальнага парку «Браслаўскія азёры», непадалёку ад якога дзяўчына вырасла. Вобразы малой радзімы творца падзяліла на дзве часткі – «раслінную» і «водную». У касцюмах дзяўчына выкарыстала шмат лёгкіх тканін і драпіроўкі сініх, блакітных і зялёных адценняў.

Злата Лук'яненка стала аўтарам калекцыі «Fleur d'iris». Яе творы былі навеяны творчасцю Іў Сен Ларана, карцінамі Ван Гога і грацыёзнай жаноцкасцю кветкі касача. Усе вобразы па задуме аўтара разлічаны на паход у офіс, а таксама – урачыстыя мерапрыемствы і вечарыны. Таму тут можна было ўбачыць такія элементы адзення, як штаны, шорты, пінжакі і гарсэты.

Праект Ганны Крывошык уяўляе сабой канцэпцыю жаночага адзення «Яны заадно», у аснову якой лягла тэорыя вялікага выбуху. Рэалізавала студэнтка сваю ідэю пасродкам касмічнай тэматыкі і адмысловых канструкцый. Таму і дэвіз яе калекцыі адлюстраваў адзінства космасу і моднай індустрыі.

Паліна Савук увасобіла ў сваёй калекцыі «FABULOSITY» вобраз сучаснай моды. Для гэтага яна выкарыстала тэндэнцыі панк-культуры, элементы жаночай бялізны і касцюмаў сучасных музычных выканаўцаў. Абарона дзяўчыны, якая суправаджалася тэматычным танцам, таксама адлюстравала новыя павевы сучасных прэзентацый моднага адзення.

Адметна, што, па рашэнні камісіі, усе чатыры дзяўчыны былі рэкамендаваны да ўваходжання ў Саюз дызайнераў. Варта адзначыць, што такі прывілей пасля заканчэння ўніверсітэта даецца самым перспектыўным студэнтам з яркімі ідэямі. Знаходжанне ў саюзе дапамагае маладым людзям больш трывала замацавацца ў прафесіі, паказаць сябе і нават атрымаць замовы. Акрамя таго, калекцыя Паліны Савук рэкамендавана да масавай вытворчасці.

Запыталі ў дзяўчат, дзе дызайнер знаходзіць ідэі для сваіх твораў. Аказваецца, што чэрпаць натхненне ён можа з усяго, што атачае – у прыродзе, музыцы, мастацтве, узаемаадносінах, народнай культуры, архітэктуры. Таму папулярная прыказка «я мастак, я так бачу» ў поўнай ступені адлюстроўвае творчы светапогляд любога стваральніка калекцый. Невыпадкова любая задума дызайнера пачынаецца з працы з творчымі крыніцамі. Затым з дапамогай спецыяльных методык ён трансфармуе якасці аб'екта натхнення ў касцюм і збірае мудборд (калаж з розных замалёвак, запісаў і фотаздымкаў таго, што перадае настрой будучай калекцыі, яе каларыстыку). Таксама вырашаецца функцыянал адзення і вызначаецца адрасат – той, хто будзе яго насіць. Так, крок за крокам ідэя выкрышталізоўваецца ў касцюм ці калекцыю.

Паказальна, што падчас вучобы студэнты маюць магчымасць папрацаваць з рознымі відамі тканін. Калі-нікалі матэрыял можа натхніць іх на нейкі прыём у стварэнні вобраза. Пасля завяршэння працы над калекцыяй і яе прэзентацыі некаторыя вобразы могуць стаць візітоўкай дызайнера-пачаткоўца, увайсці ў калекцыю якога-небудзь прадпрыемства, а некаторыя выкарыстоўваюцца маладымі людзьмі ў паўсядзённым жыцці.

– Цікава сачыць за тым, як студэнты змяняюцца, адбываецца свайго роду эвалюцыя. На першым курсе яны выглядаюць проста – футболка, джынсы, кофта. На другім курсе ў гардэробе пачынаюць з'яўляцца іх аўтарскія рэчы, а ў апошнія гады навучання – у кожнага свой стыль. Адразу бачна: гэта ідуць дызайнеры адзення, – усміхаецца кіраўнік кафедры.

Таксама немагчыма не пацікавіцца, колькі часу жыве калекцыя. Алена Ігараўна адзначае, што калекцыя, узятая на вытворчасць, жыве столькі, колькі жывуць тэндэнцыі, якія пануюць у той час, калі яна ствараецца.

– Калі зараз узяць рэчы, зробленыя 10 гадоў назад, гэта будзе адразу бачна. Бо адзенне яскрава адлюстроўвае эстэтыку часу, – тлумачыць Алена Атраховіч. – Калі ж калекцыя аўтарская, яна можа не страчваць актуальнасці вельмі доўга, паколькі там выяўляецца індывідуальнасць творцы, якая часта бывае па-за часам.

На развітанне задаём пытанне, ці магчыма стаць высакакласным дызайнерам, не маючы спецыяльнай адукацыі:

– Думаю, такая задача невыканальная, бо дызайнер – гэта шматгранная прафесія. Навучыць чалавека проста шыць можна – ёсць жа розныя курсы. Але зрабіць з яго сапраўднага прафесіянала з вялікай літары – нельга. Гэта прафесія вымагае шмат разнастайных ведаў у розных галінах: матэрыялазнаўстве, гісторыі, культуры, маляванні, кампазіцыі і г.д. А хутка гэтаму не навучышся, – рэзюмавала Алена Ігараўна.

**Ірына ІВАШКА**









УНІВЕРСІТЭТ
18 ліпеня 2023 года, № 7 (2272)

Менавіта так гавораць калегі вадзіцеля аўтагаспадаркі БДУ Мікалая ШУКАЛЫ, калі той заступае на змену. З чаго складаецца яго працоўны дзень і простае чалавечае шчасце, падчас змены са спецыялістам даведалася карэспандэнт газеты «Універсітэт».

# Шукала на лініі



## «Тармазы – наша жыццё»

Мікалай Шукала працуе на машыне, якая замацавана за цэнтрам грамадскага харчавання БДУ. Ён і трое яго калег абслугоўваюць 18 сталовых і буфетаў універсітэта. Калі пачынаецца навучальны год, на маршрут выходзяць 4 машыны, цяпер жа, пакуль студэнты сышлі на канікулы і многія пункты грамадскага харчавання часова зачынены, у актыўным рэжыме працуе адно аўто.

З Мікалаем Леанідавічам сустракаемся за дваццаць хвілін да пачатку змены. Перад тым, як сесці за руль, кіроўцу трэба прайсці некалькі працэдур. Але пра ўсё – па парадку. Першая наша «геалакацыя» перад выездам – база аўтагаспадаркі.

– Коля, ты нам новага вадзіцеля прывёў? – жартуюць, убачыўшы незнаёмага чалавека, кіроўцы.

– Так, гэта наш новы вадзіцель, – вітаецца за руку з калегамі, усміхаючыся, Мікалай Леанідавіч. Мы накіроўваемся праходзіць медыцынскі агляд і падпісваць пуцявы ліст. Пакуль мой «напарнік» ідзе да доктара, перакідваюся парай слоў з начальнікам аўтагаспадаркі Сяргеем КУПРЫЯНІКАМ.

– Мікалая Леанідавіча магчыма апісаць толькі са станоўчага боку: ён пунктуальны і старанны чалавек. Умее вырашыць любы канфлікт сярод калег, пераадолець любую цяжкасць у працы, можа цалкам ацаніць сітуацыю і прыняць правільнае рашэнне. Мне б такіх, як Шукала, чалавек 10! – апісвае падначаленага Сяргей Мікалаевіч.

Каб выехаць па маршруце, на руках у Мікалая Леанідавіча павінны быць пасведчанне кіроўцы, медыцынская даведка, пуцявы ліст на яго імя са штампам медыка і механіка. Нам засталося толькі агледзець машыну і паставіць пячатку на выезд, таму накіроўваемся ў амбар для тэхнікі, дзе нас чакае жалезны чатырохкалёсны сябар Мікалая Шукалы і штодзённае абслугоўванне.

– У мяне машына-ізатэрма. Гэта значыць, што кузаў абабіты спецыяльным пакрыццём, якое дазваляе захоўваць прадукты, не прапускаючы да іх паветра. Давайце паглядзім, ці пазнаеце яе? – прапаноўвае правесці эксперымент Мікалай Леанідавіч.

Паколькі кіроўца расказаў пра некаторыя асаблівасці, выбіраем сярод трох машын з крытым верхам. Працоўны аўтамабіль майго спадарожніка вылучаецца асаблівай дагледжанасцю, а таксама ўгадваецца па паводзінах кіроўцы: падыходзячы да сваёй машыны, ён міжволі сціскае крок. Аказваецца, на гэтай бардовай «газелі» Мікалай Леанідавіч працуе тры годы. Унутры аўтамабіля таксама не знойдзеш нічога лішняга – трывала замацаваліся там толькі працоўная куртка і гаспадарчыя пальчаткі.

– Самая значная замінка, якая можа ўзнікнуць перад выездам, – пустое кола. Звечара прыедзеш – візуальна ўсё добра, а раніцы шына пустая. Тады, пакуль праходжу медагляд і забіраю пуцявы ліст, наш слесар вельмі хутка ліквідуе гэту непаладку. Калі я спраўляюся раней, робім гэта разам. За ўсю практыку не было такога, каб машына, напрыклад, не завялася. Таму пры любым раскладзе ў рэйс выходзім як мае быць, – уводзіць у курс справы мой «напарнік». – Штодзень мы заязджаем на рамонтную яму, механік правярае мацаванне дэталей, тармазную сістэму, сігнальныя агні, ціск у шынах. Калі, напрыклад, у тармазной калодцы ёсць падцёк – без рамонту машыну ні за што не выпусцяць у рэйс. Гэта ж наша жыццё.



*Кладаўшчыца С. Маскалёва падпісвае суправаджальныя дакументы*

– Юра, падкажы, як там лямпачкі стоп-сігнала? Гараць?

– Парадак! – дае адмашку калега.

Гадзіннік паказвае 8:00, а значыць, пачынаецца працоўная змена, якая прадоўжыцца да 16:45. Мікалай Леанідавіч, праверыўшы дакументы, адзначае: «Цяпер мы ўзброеныя» – і яго машына выходзіць на маршрут. На пропускным пункце ахова дагледзе кузаў, і ўслед кіроўцу даносіцца: «Шчаслівага шляху!» – ці, як сказалі б паміж сабой самі кіроўцы: «Пагналі!»

– Таксама ў рэйсе можна пачуць: «Ні цвіка, ні жазла». Гэта пажаданні таго, каб на змене не было непаладак і вадзіцеля не спыніў нарад ДАІ, – знаёміць з прафесійнымі традыцыямі Мікалай Шукала. – Скажуць: «Цішэй ідзеш – далей будзеш», – а вы разумееце: «Чым меншая хуткасць, тым далей да месца, куды трэба даехаць». Такія ў нас прафесійныя жарты.

## Задавальненне, ад якога не стамляешся

Цяга да тэхнікі ў Мікалая Леанідавіча з дзяцінства. Ён нарадзіўся ў вёсцы Каладзіно Уздзенскага раёна. Яго старэйшы брат доўгі час працаваў на машыне, і малога заўсёды цягнула да яго. Таму пасля восьмага класа ён вырашыў ездзіць за 30 кіламетраў у горад, каб вывучыцца на вадзіцеля. У іншай прафесіі юнак сябе не бачыў, і, прыязджаючы на вучобу ў панядзелак, дадому ён вяртаўся толькі ўвечары пятніцы. Вадзіцельскае пасведчанне хлопец атрымаў у 1979 годзе. І з тых часоў вось ужо 44 гады Мікалай Шукала не развітваецца з баранкай.

– Мне гэта так даспадобы, вам не расказаць! Мая мара спраўнілася! Я рады ехаць за рулём у любое месца, дзе б яно ні знаходзілася. Мне падабаюцца палі, лугі, азёры, гарады за акном. Гэта задавальненне, ад якога не стамляешся, якое не надакучвае, – дзеліцца Мікалай Леанідавіч.

У БДУ Мікалай Шукала працуе з 2007 года. Свой прафесійны шлях ва ўніверсітэце ён пачынаў у юрыдычным каледжы, а ў 2017 годзе перавёўся ў аўтагаспадарку. З калегамі ён сышоўся хутка, тым больш што кіроўцы – сяброўскі і добразычлівы народ.

– Усе адзін аднаго выручаюць. Вось нядаўна патрэбна было аўтобус у рэйс выпускаць. А там знайшлі працяканне вадкасці, што ахалоджвае матор. Адкрылі капот – усе вадзіцелі, што былі ў ангары, сабраліся купай і вырашылі праблему. Нават тыя, хто не меў да аўтобуса ніякага дачынення. У кожнага з нас ёсць навык у нечым, таму разам мы вырашаць праблему прасцей, можна знайсці любую дробязь. Задачу ж патрэбна выконваць у любым выпадку, а хлопцы рады дапамагчы, – успамінае Мікалай Шукала. – Хутка па сваёй частцы пытанні вырашае наш слесар. Таксама, калі нехта ламаецца на маршруце, па яго выязджае іншая машына, і «паламанага» на тросе цягнуць у гараж для рамонту.

## «Калі ты шчаслівы, дні прабягаюць»

Вольны час мой «калега» стараецца праводзіць з сям'ёй: жонкай, дачкой і двума ўнукамі. Дом бацькоў Мікалая Леанідавіча цяпер стаў дачай, куды ўсе яны стараюцца наведацца, як толькі пацяплее.

– Маё хобі – гэта газон. Кожны раз, як прыязджаю, мне трэба зрабіць яго раўнюткім: не люблю, калі недзе выбіваецца трава. На ім мы з унукам і суседскімі дзецьмі гуляем у футбол і бадмінтон, – пералічвае любімыя спосабы баўлення вольнага часу кіроўца. – Калі грыбны сезон – усе ў лесе. У нас побач з вёскай лес, таму ўся наша сям'я на грыбах. Аднойчы з дачкой знайшлі падасінавік з шапкай памерам з руль. Сам упершыню такое бачыў – інакш не паверыў бы! А найбольшая колькасць грыбоў, якія я сабраў на адным месцы, – 17 штук. Хаця мне больш падабаецца па лесе пахадзіць. Гэта такі азарт!

Асаблівы чалавек у жыцці Мікалая Шукалы – гэта, бясспрэчна, жонка Алена Паўлаўна. Разам яны ўжо 41 год – пара распісалася адразу ж, калі Мікалай Леанідавіч вярнуўся з арміі.

– У нашых адносінах няма паўсядзённасці, бо мы кахаем адзін аднаго. Калі ты шчаслівы, дні прабягаюць, бо ўсё ў радасць. Ты заўсёды ведаеш, калі лепей прамаўчаць, а калі, наадварот, сказаць нешта добрае. Канешне, бываюць рознагалоссі – без гэтага ў жыцці ніяк, але ўсе яны дробязі. З гадамі звыкаеш сыходзіць, і людзям працай разумець адзін аднаго, – у голасе майго суразмоўцы пракрадваецца пяшчота. – Разумееце, нам добра разам. Нават калі ў яе выхадны, абавязкова падымецца разам са мной у 6 гадзін, каб прыгатаваць мне каву і бутэрброды. Спрачаюся: «Ды куды ты? Адпачні». А яна заўсёды правядзе мяне, памахае ў акенца рукой на развітанне. Пасля ў 8:15–8:20 абавязкова патэлефануе, спытае, як даехаў да кропкі. Гэта сёння не набірае, бо ведае, што я з вамі.

## Самы лепшы Коля

Першы пункт на маршруце змены – склад прадуктаў на Кастрычніцкай, 4а. Тут Мікалая Леанідавіча з дакументамі ўжо чакаюць загадчыца склада *Ірына Васілеўская* і кладаўшчыца *Святлана Маскалёва*. І пакуль ён дапамагае грузчыкам, спрабую паглядзець на свайго спадарожніка вачыма яго калег. Ірына Мікалаеўна і Святлана Уладзіміраўна апісваюць Мікалая Шукалу як адказнага, добрага і надзейнага чалавека з выдатным пачуццём гумару. Жанчыны кажуць, што ён той вадзіцель, які заўсёды заглыбляецца ў праблемныя сітуацыі і стараецца іх рашыць.

– Бывае, зусім не ведаеш, ці праўду гаворыць Мікалай Леанідавіч, ці жартуе. А толькі ўбачыш яго ўсмешку – і ўсё навідавоку. Калі Шукала на лініі – пытанняў няма. Усё, што ні папросіш, зробіць, не падвядзе. Нашы грузчыкі з ім любяць ездзіць – ён і ім заўсёды дапамагае. З гэтым чалавекам любое пытанне рашаецца за хвіліну. Такое вам пра яго кожны скажа, – амаль у адзін голас гавораць Ірына Мікалаеўна і Святлана Уладзіміраўна, звяртаючыся да супрацоўнікаў, якія займаюцца пагрузкай тавараў. – Хлопцы, скажыце, наш Коля які?

– Самы лепшы, – усміхаюцца грузчыкі *Уладзімір Худзякоў* і *Сяргей Лундзін*. «Хлопцы» паважаюць Мікалая Шукалу нездарма – нягледзячы на тое, што мужчыны працуюць тут нядаўна, ён ужо паспеў вывучыць некаторыя іх звычкі.



*Уладзімір Худзякоў*

Цяпер задача нашай змены – адвезці прадукты ў сталовую па вуліцы Кастрычніцкая, 10а. Таму на маршруце нас ужо трое: мы з Мікалаем Леанідавічам і «галоўны па пагрузцы» Валодзя. Пасля прыёмкі тавараў іх трэба пераўзважыць, каб маса прывезенага супадала з масай, заяўленай у накладных.

– Усё сходзіцца?

– Так, усё цудоўна!

Уваходны званок – і Мікалай Шукала забірае ў кузаў абрусы для мыцця. Зараз нам трэба вярнуцца назад, затым адвезці неабходнае для працы сталовай №1. Пасля па патрэбах пунктаў грамадскага харчавання мы будзем ездзіць усю змену. Калі б на гэты дзень у аўтагаспадарцы былі заяўкі ад факультэтаў ці па графіку стаяла б дэзінфекцыя кузава, машына паехала б выконваць запыт ці адправілася б на мыйню. Так, у дзень Мікалай Леанідавіч можа праехаць 60-70 кіламетраў.

Пакрысе на вуліцы пачынае накрапваць дождж, на неба набягаюць хмары, але ў кабіне машыны Мікалая Шукалы па-ранейшаму светла і ўтульна. Магчыма, таму, што тут заўсёды жыве добры настрой і любоў да таго, што робіць кіроўца.

**Ірына ІВАШКА**


Даніiл Лузан


Кірыл Вярбіла

# Скарбонка талентаў БДУ

Сярод навучэнцаў БДУ шмат стыпендыятаў з банка даных адоранай моладзі Беларусі. Сярод іх – магістрант хімічнага факультэта Кірыл ВЯРБІЛА і студэнт ФМА Даніiл ЛУЗАН.

## «Чалавек павінен ставіць сабе планкі»

Два нязменныя спадарожнікі Кірыла Вярбілы – гадзіннік і мабільны тэлефон. Першы дапамагае рацыянальна выкарыстоўваць час, другі – пастаянна быць на сувязі.

Адораны магістрант хімфака адносіць сябе да людзей, якія імкнуцца ўсё рабіць добра для таго, каб за зробленае было не сорамна і каб яго праца прыносіла плён. Сам жа ён цэніць у навакольных шчырасць, адкрытасць і мэтанакіраванасць.

– Я добры, адказны, імкнуся да справядлівасці. У партрэце чалавека важныя ўсе якасці, але, думаю, кожны павінен быць на сваім месцы, несці адказнасць за сваю дзейнасць. Нельга адначасова быць усюды і ва ўсім добра разбірацца, трэба мець уласную нішу. Немагчыма набыць сур'ёзныя прафесійныя навыкі адразу ва ўсіх сферах, – кажа Кірыл. – А самае важнае ў жыцці – гэта людзі і адносіны з імі. Патрэбна мець побач такіх людзей, дзеля якіх захочацца развівацца, якім ты будзеш дапамагаць рэалізоўваць іх мары і якія змогуць даць параду табе.

Кірыл вучыўся ў гімназіі №1 г. Ваўкавыск. Да шостага класа ён, як і многія школьнікі, неабыякавыя да прыродазнаўчых дысцыплін, хадзіў на алімпіяды па матэматыцы і фізіцы. А пасля настаўніца хіміі **Валянціна Навумік** зацікавіла сваім прадметам і прапанавала займацца ім паглыблена. Хлопец зацікавіўся, рушыў далей у гэтым напрамку, што пасля дзявятага класа прывяло яго ў Ліцэй БДУ. Спачатку Кірыл падумваў пра будучую прафесію ў кантэксце медыцыны, але вырашыў акунуцца з галавой у хімію – і ўжо шосты год ён вучыцца ў БДУ.

Зрабіць крок у навуку тады яшчэ студэнту хімфака дапамог навуковы кіраўнік, а цяпер дэкан хімічнага факультэта **Аляксандр Зураеў**. Іх знаёмства адбылося падчас лабараторных заняткаў па неарганічнай хіміі. Выкладчык даваў студэнтам дадатковыя задачы «на падумаць», пазней прапанаваў Кірылу паспрабаваць сілы ў даследаваннях і паспрыяў таму, што хлопец прыйшоў у педагагічную сферу. Зараз Кірыл Вярбіла – асістэнт кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі. Таксама ўплыў Аляксандра Віктаравіча выявіўся ў навуковых інтарэсах і пошуках магістранта – распрацоўка біялагічна актыўных рэчываў, што могуць стаць новымі лекавымі сродкамі. Пры гэтым малады даследчык у складзе групы вывучае не толькі рэчывы, але і новыя метады распрацоўкі лекаў.

– Вытворчасць лекавых сродкаў можна паспрабаваць аптымізаваць: паскорыць, зменшыць кошт сыравіны і да т. п. Паколькі гэта нятанная працэдура, важна не страціць у якасці прадукту. Мая дыпломная работа і магістарская дысертацыя прысвечаны якраз гэтаму, – тлумачыць Кірыл Вярбіла.

Свае ўзнагароды магістрант называе «ступеньчатай эвалюцыяй» у вывучэнні прадмета. З 2015 па 2017 год ён атрымліваў імянную стыпендыю з прэзідэнцкага фонду (9-11 клас), на 4 курсе стаў уладальнікам дыплома II ступені на Рэспубліканскім конкурсе навуковых работ студэнтаў, дзякуючы чаму трапіў у банк даных адоранай моладзі.

Сілы, каб шмат працаваць, малады чалавек знаходзіць у выкладчыцкай дзейнасці. Як выкладчык хімфака ён задзейнічаны ў арганізацыі навучальнага працэсу для адораных дзяцей у Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку. Кірыл кажа, што натхняецца дзіцячай цікаўнасцю да хіміі. У такія моманты, калі дзеці выбіраюць для паступлення хімічны факультэт, ён найбольш адчувае плён сваёй працы.

– Цікава бачыць, што студэнты і школьнікі, якія займаліся ў мяне, ужо заканчваюць універсітэт. Здарова, калі яны з дапамогай выкладчыкаў пачынаюць спасцігаць тое, чаго раней не маглі ўсвядоміць, разбіраюцца ў розных тэмах, – заўважае Кірыл Вярбіла.

Таксама аднаўляць сілы яму дапамагаюць вандроўкі па краіне. Хлопец прызнаецца, што поўным адпачынак атрымліваецца тады, калі ён выязджае з Мінска, мяняе абставіны. Падарожжы па раённых і абласных цэнтрах, па словах магістранта, не толькі адпачынак для душы, але і сродак для пашырэння кругагляду, разрадка для галавы.

Магістрант кажа, што ў яго ёсць планы праз 5 гадоў абараніць кандыдацкую дысертацыю. Аднак гэта для яго не самамэта.

– Рэалізуецца гэта ці не – пакажа час. Чалавеку трэба ставіць нейкія планкі, якія яму трэба ўзяць, каб рухацца наперад і не збівацца з свайго шляху. Гэта не абавязкова мэта ў навуцы, могуць быць планы ў творчасці ці ў асабістым жыцці. І маленькімі крокамі чалавек даходзіць да яе, – упэўнены Кірыл. – Важна разумець, чаму ты займаешся той ці іншай дзейнасцю. Ёсць шмат таленавітых людзей, якія хутка вучацца, здольныя ствараць, але калі яны не бачаць у гэтым сэнсу, то неўзабаве любая дзейнасць можа стаць працай дзеля працы.

## «Лаві момант і атрымлівай ад яго асалоду»

За плячыма Даніiла Лузана перамогі ў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах, шмат замежных стажыровак і валанцёрскай практыкі. Ён уладальнік звання «Студэнт года БДУ», захапляецца жыццём і мае ўласную калекцыю пінгвінаў.

Цяпер Даніiл Лузан – чацвёртакурснік спецыяльнасці «міжнародныя адносіны». Хлопец кажа, што лепей за ўсё яго апісвае фраза «чалавек, які не шукае лёгкіх дарог». Ён пастаянна знаходзіцца ў пошуках новых уражанняў, любіць знаходзіць нестандартныя шляхі рашэння паўсядзённых задач. Менавіта гэта ў свой час прывяло яго на факультэт міжнародных адносін, а пасля – да навуковых пошукаў.

– На факультэце міжнародных адносін я апынуўся пасля дзіцячых фантазій стаць дыпламатам. З 5 класа я быў упэўнены, што хачу звязаць жыццё з якой-небудзь міжнароднай дзейнасцю. Тады падавалася, што дыпламатыя – адзіны напрамак, які існуе ў гэтай галіне. Нягледзячы на такое вузкае ўяўленне, я мэтанакіравана ішоў да мары. ФМА БДУ выбраў таму, што гэта галоўная альма-матар спецыялістаў-міжнароднікаў у нашай краіне, – кажа чацвёртакурснік.

У першы час хлопец спраўляўся толькі з навучальнымі задачамі і крокаў у навуку не рабіў. Усё змяніла сустрэча з навуковым кіраўніком – прафесарам кафедры міжнародных адносін **Святланай Свілас**. Студэнт паспрабаваў даследчыцкую дзейнасць – і пасля ужо не змог адарвацца. Навука для Даніiла – гэта глыбокі творчы працэс, нягледзячы на тое, што ў яе ёсць фармальныя рамкі, адмысловы стыль і строгія патрабаванні. З той пары Даніiл плённа ўдзельнічае ў навуковых конкурсах рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню, шмат публікуецца. За даследчыя працы, якія закранаюць тэмы знешнепалітычных інтарэсаў Беларусі, хлопец неадноййчы станавіўся прэзідэнцкім стыпендыятам, а зараз знаходзіцца у банку даных адоранай моладзі краіны і занесены на Дошку гонару БДУ. Акрамя таго, у яго скарбонцы дасягненняў – 1-я катэгорыя на XXVII Рэспубліканскім конкурсе навуковых работ студэнтаў, перамогі ў конкурсах СНД, Фонду падтрымкі публічнай дыпламатыі імя А. М. Гарчакова і пасольства Індыі, званні «Студэнт года БДУ – 2021» у намінацыі «Навука» і «Найлепшы выпускнік БДУ – 2023» у намінацыі «Зорка БДУ». А яшчэ ён уладальнік падзяк ад пасольстваў Венесуэлы, Індыі і пасольства Беларусі ў Калумбіі.

– На першым курсе я зацікавіўся праблематыкай міжнародных адносін і, у прыватнасці, ААН. Трохі падумаўшы, вырашыў, што мне будзе цікава прасачыць, з якімі цяжкасцямі сутыкаецца гэта арганізацыя і як падыходзяць да іх вырашэння ў розных краінах. Гэта падштурхнула мяне да тэмы рэфармавання ААН. Я даследаваў падыходы розных дзяржаў да рэформы арганізацыі, пасля шукаў магчымасці па супрацоўніцтве Беларусі з іншымі краінамі ў гэтым кірунку, спрабаваў фармуляваць рэкамендацыі, – узгадвае чацвёртакурснік. – Зараз мае навуковыя пошукі звязаныя з праблемамі развіцця Афрыкі (калі гаварыць больш вузка, то я вывучаю знешнюю палітыку Мадагаскара). Магу сказаць, што сёння я адзіны беларускі спецыяліст па гэтай краіне.

Думка заняцца Мадагаскарам, які нямала людзей ведаюць толькі паводле мультфільма «Пінгвіны Мадагаскара», нарадзілася падчас стажыроўкі ў Іспанію. Тады студэнт прачытаў кнігу пра гісторыю краіны і зразумеў, што гэтая дзяржава радыкальна адрознівалася ад іншых афрыканскіх дзяржаў XIX стагоддзя. Па словах Даніiла, на той час Мадагаскар быў краінай, якая магла канкурыраваць з Еўропай. Зрабіўшы такое адкрыццё, студэнт вырашыў прааналізаваць яго шлях ад таго часу да нашых дзён праз прызму сваёй спецыялізацыі.

Дарэчы, з пінгвінамі Даніiла Лузана звязваюць не толькі асацыяцыі з яго навуковай дзейнасцю – ён заўзяты збіральшчык статуэтак і цацак пінгвінаў. Гісторыя незвычайнай калекцыі пачалася, калі хлопец у трохгадовым узросце трапіў у бальніцу, дзе вымушаны быў сустракаць Новы год. Віншаваць дзяцей традыцыйна прыйшлі Дзед Мароз са Снягуркай. У падарунак малому дастаўся цацачны пінгвін, якога ён я выцягнуў са святочнага мяшка казачнага дзядулі. Цяпер з усіх падарожжаў і стажыровак хлопец імкнецца прывезці новых «гадаванцаў».

Даніiл спадзяецца, што вопыт вывучэння ААН не пройдзе дарма: ён марыць папрацаваць у якой-небудзь са структур арганізацыі, у гэтым бачыць набыццё вопыту міжкультурнага ўзаемадзеяння, зладжанасці і рашэння праблем сусветнага маштабу. У яго найбліжэйшых планах – паглыбленне ўзроўню валодання англійскай і іспанскай мовамі (акрамя таго, што пасля выпуску студэнт будзе спецыялістам па міжнародных адносінах, ён зможа практыкаваць як перакладчык-рэферэнт).

– Іспанскую мову я пачаў вывучаць ва ўніверсітэце і проста захапіўся ёй. У нас вельмі падобны тэмперамент. Таму я валодаю ёй амаль дасканала і хачу дапамагаць іншым у яе вывучэнні, – разважае Даніiл Лузан.

Каб болей узаемадзейнічаць з носьбітамі моў, хлопец часта ўдзельнічае ў валанцёрскіх праектах, звязаных з маўленчай практыкай. За гады вучобы ён паспеў пабыць валанцёрам-перакладчыкам праграмы развіцця ААН у Панаме, дапамагаў на Праграме дабравольцаў ААН і інш. А зараз разам з загадчыцай кафедры рамана-германскіх моў міжнароднай прафесійнай дзейнасці **Вольгай Сідарэвіч-Стаховай** хлопец распрацоўвае дапаможнік па прафесійна-арыентаванай лексіцы іспанскай мовы, які ў далейшым будзе прымяняцца ў навучальным працэсе студэнтаў ФМА. Гэта самыя буйныя задачы, якія паставіў перад сабой адораны студэнт.

– Я люблю жыць у поўным сэнсе гэтага слова: мне патрэбна атрымліваць уражанні, камунікаваць з людзьмі, бо даведваюся іх гісторыі і бяру адтуль нешта на заметку. А яшчэ я рамантык: калі-нікалі пішу вершы, гэта дазваляе мне больш поўна спасцігаць жыццё, – прызнаецца студэнт. – Таму, напэўна, маё любімае выказванне: «Лаві момант і атрымлівай ад яго асалоду».

**Ірына ІВАШКА**

**Даведка:**
Банк даных адоранай моладзі – аўтаматызаваная сістэма цэнтралізаванага ўліку, назапашвання і сістэматызацыі інфармацыі аб навучэнцах, студэнтах, курсантах, якія атрымалі заахвочванні спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, якія з'яўляюцца пераможцамі міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд (конкурсаў, турніраў, іншых спаборніцтваў) па вучэбных прадметах, якія паказалі высокі ўзровень падрыхтоўкі ў асобных прадметных галінах, асаблівыя поспехі ў навукова-даследчай, творчай, інтэлектуальнай дзейнасці.

УНІВЕРСІТЭТ
18 ліпеня 2023 года, № 7 (2272)

## АКТУАЛЬНА

### СЁЛЕТА Ў БДУ АДКРЫЮЦЬ ЧАТЫРЫ НОВЫЯ ПРОФІЛІ МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНАЙ МАГІСТРАТУРЫ

Гэта абумоўлена ростам іх запатрабаванасці сярод замежных студэнтаў і магчымасцю атрымаць веды ў сумежных галінах навуковай і практычнай дзейнасці. Дзякуючы шматпрофільнасці навучальнай праграмы іх выпускнікі канкурэнтныя на нацыянальным і міжнародным рынку працы. Заняткі праводзяцца ў вочнай форме на двух факультэтах, у залежнасці ад навучальнай дысцыпліны. Уведзена практыка сумеснага кіраўніцтва магістэрскімі дысертацыямі. Так, у кожнага магістранта прадугледжваюцца два навуковыя кіраўнікі, што спрыяе больш дэталёвай прапрацоўцы міждысцыплінарнага навуковага даследавання. Па заканчэнні навучання выдаецца дыплом з прысваеннем навуковай ступені «магістр».

Факультэты геаграфіі і геаінфарматыкі (ФГГ) і эканамічны распрацавалі праграму «**Зялёная эканоміка і ўстойлівае развіццё арганізацыі**» па спецыяльнасці «эканоміка». Выпускнікі змогуць аналізаваць практычныя аспекты экалагічных рызык, выкарыстоўваць «зялёны» маркетынг у арганізацыі дзейнасці прадпрыемстваў, выяўляць прычыны і ацэньваць змены навакольнага асяроддзя, праводзіць аналіз фактараў і рызык устойлівасці экасістэм пры бягучым узроўні эканамічнага развіцця і ў перспектыве ацэньваць эфектыўнасць дасягнення вугляроднай нейтральнасці эканомікі на глабальным, рэгіянальным і лакальным узроўнях, выконваць матэматычную апрацоўку, статыстычны і прасторавы аналіз даных пра навакольнае асяроддзе, абагульняць і сістэматызаваць вынікі даследаванняў. Дарэчы, сёння большасць краін свету пераарыентавала сваю экалагічную палітыку на пераход ад традыцыйнай мадэлі, у якой ахова навакольнага асяроддзя разглядаецца як нагрузка на эканоміку, да мадэлі, дзе экалогія выступае рухавіком развіцця. У нашай краіне палажэнні, звязаныя з развіццём «зялёнай» эканомікі, адлюстраваны ў шэрагу нарматыўных прававых актаў, у тым ліку ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021-2025 гады, а таксама ў Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця Беларусі на перыяд да 2035 года.

Стартуе набор у сумесную магістратуру ФГГ і журналістыкі «**Журналістыка ў міжкультурнай і геапалітычнай камунікацыі**» па спецыяльнасці «журналістыка». Сёння ёсць запатрабаванне ў журналістах, якія валодаюць кампетэнтнымі ведамі ў галіне геапалітыкі, эканомікі, краіназнаўства і інш. Комплекснае вывучэнне прапанаваных дысцыплін дадзенай праграмы дазволіць выпускнікам ствараць якасныя медыяпрадукты і весці прафесійную дзейнасць ва ўмовах полікультурнасці рэгіёнаў і свету з улікам прыродна-рэсурсавага патэнцыялу, геапалітычных і сацыяльна-эканамічных працэсаў. Выпускнікі змогуць выкарыстоўваць тэарэтыка-метадалагічныя асновы культурнай геаграфіі для характарыстыкі краін і рэгіёнаў свету, а таксама аналізаваць геапалітычную сітуацыю на сусветным і рэгіянальных узроўнях для ўстанаўлення рэгіянальных сувязяў паміж геастратэгічнымі аспектамі сусветнага развіцця.

Новая праграма «**Фінансы ў лічбавай эканоміцы**» спецыяльнасці «эканоміка» эканамічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў накіравана на падрыхтоўку аналітыкаў, якія валодаюць прафесійнымі кампетэнцыямі ў галіне лічбавізацыі фінансавага, інвестыцыйнага і антыкрызіснага кіравання для стварэння і падавання фінансавых і банкаўскіх прадуктаў і паслуг. Асаблівасцю праграмы з’яўляецца акцэнт на прыкладным прымяненні спецыялістамі атрыманых ведаў ва ўмовах фарміравання лічбавай эканомікі.

Праграма «**Прыкладная эканоміка, менеджмент і права**» спецыяльнасці «менеджмент» эканамічнага і юрыдычнага факультэтаў дазволіць падрыхтаваць аналітыкаў у галіне бізнес-працэсаў і эканамічнай палітыкі. Так, адукацыйны курс арыентаваны на вывучэнне праблем кіраўнічай эканомікі, эканамічнага аналізу, ацэнкі рызык і канкурэнтаздольнасці кампаній і галін. Таксама адмысловая ўвага надаецца прававым асновам і заканадаўчай базе.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб’яўляе конкурс

## на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

**Факультэт сацыякультурных камунікацый**

| Назва пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду* | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|---|
| Загадчык кафедры інфармацыйных тэхналогій | 5 гадоў | Вышэйшая адукацыя, наяўнасць вучонай ступені доктара або кандыдата навук, навуковых прац або вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| Дацэнт кафедры тэорыі і практыкі перакладу | 5 гадоў | Вышэйшая адукацыя, наяўнасць вучонай ступені доктара або кандыдата навук, навуковых прац або вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Дацэнт кафедры мастацтваў і асяроддзевага дызайну | 5 гадоў | |
| Старшы выкладчык кафедры мастацтваў і асяроддзевага дызайну | | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку, не менш за 5 гадоў. |
| Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Курчатава, 5, каб. 208; да 16 жніўня.<br>Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Курчатава, 5, каб. 409; да 14 верасня. | | |

*(дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

# Факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ і Дзяржаўны камітэт па маёмасці Рэспублікі Беларусь

## запрашаюць да ўдзелу ў геаграфічным фотаконкурсе «Зямля мая беларуская»

Геаграфічны фотаконкурс праводзіцца ўпершыню і прысвечаны Году міру і стварэння.



Ідэяй для назвы конкурсу і яго намінацый паслужыла творчасць класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча, які сваімі творамі адкрывае для чытачоў прыгажосць беларускай зямлі, унікальнасць і разнастайнасць яе духоўнай і матэрыяльнай культуры, насычаную падзеямі гісторыю. Захапленне ад усяго роднага і закаханасць у Беларусь Уладзіміра Караткевіча натхнілі арганізатараў конкурсу паказаць чароўнасць беларускай прыроды, гістарычную спадчыну нашай краіны і яе культурнае багацце, людзей, якія насяляюць яе, іх мінулае, сучаснасць і будучыню, выкарыстоўваючы ў якасці інструмента фатаграфію.

Праект заклікаем аб’яднаць найлепшыя фотаработы пра Беларусь, паказаць маляўнічасць і разнастайнасць родных пейзажаў, зацікавіць гісторыяй і каларытам жыцця беларускага народа, прадэманстраваць любоў да роднай Зямлі.

Удзельнікам конкурсу можа стаць кожны, незалежна ад месца жыхарства, грамадзянства і ўзросту. Адзіная ўмова – уласныя фатаграфіі павінны быць зробленыя на тэрыторыі Беларусі. Ва ўсіх намінацыях будуць вызначаны пераможца і ўладальнікі II і III месцаў. Галоўны прыз у кожнай намінацыі – планшэт.

**Намінацыі:**

1. «Ад палескіх імхоў да асвейскіх крыніц»: кадры, якія дэманструюць дзівосную прыгажосць беларускай прыроды: яе лясы і палі, азёры і рэкі, раўніны і ўзвышшы і г. д.

2. «Зямля пад белымі крыламі»: панарамныя віды, знятыя з вышыні птушынага палёту (напрыклад, з дапамогай квадракоптара): аб’ектамі могуць выступаць прыродныя пейзажы, ландшафты, людзі, будынкі, жывёлы і інш.

3. «Людзі зямлі беларускай»: намінацыя дэманструе беларускі народ у асобах.

4. «Куфар жыцця»: выявы асаловы ад жыцця ў імгненні, рух жыцця і яго каларыт.

5. «Камяніцы, і гмахі, і вежы»: фатаграфіі гарадской прасторы ад старажытных славутасцяў да ультрасучасных урбаландшафтаў.

6. «Вёска, о родная вёска мая!»: выявы беларускай сельскай мясцовасці і вясковага духу.

7. «Праз дым стагоддзяў»: сучасныя фотакампазіцыі, якія паўтараюць архіўныя фота альбо малюнкі, гравюры і інш. (для дадзенай намінацыі абавязковае прадстаўленне дзвюх ілюстрацый: гістарычнай і ўласнай сучаснай).

Прыём фатаграфій ажыццяўляецца з 1 ліпеня па 31 кастрычніка 2023 года. Адбор фіналістаў – у лістападзе 2023 года. Падвядзенне вынікаў фотаконкурсу, выстава фотаработ і ўзнагароджанне пераможцаў адбудзецца ў снежні 2023 года.

Для ўдзелу ў конкурсе неабходна да 31 кастрычніка 2023 года ўключна прайсці рэгістрацыю (для кожнай намінацыі) па спасылцы *https://forms.gle/A95fu7u7MXQXjk5x9* і загрузіць фатаграфіі (для кожнай намінацыі не больш за 3).

**Патрабаванні да фотаработ:**

1. Фатаграфіі прадстаўляюцца ў лічбавым выглядзе:
- фармат – JPEG, HEIC.
- разрозненне – не менш за 12 мегапікселяў.

2. Конкурсныя работы не павінны мець аўтарскіх знакаў, дадатковых рамак і г. д.

3. Дазваляецца апрацоўка фатаграфій з дапамогай графічных рэдактараў, якія толькі падкрэсліваюць аўтарскую задумку (карэкцыя кантрасту, кадраванне, тэхнічнае рэтушаванне). Фотавыявы, у большай ступені створаныя з дапамогай графічных рэдактараў (фотакалажы), не допускаюцца да ўдзелу ў конкурсе.

4. Усе работы павінны суправаджацца назвай, якая адлюстроўвае іх сэнсавую нагрузку ў рамках тэматыкі конкурсу, з указаннем месца і года здымкі.

5. Аўтарскія правы на фотаработы належаць аўтарам гэтых работ.

6. Арганізатары маюць права дэманстраваць на выставах, публікаваць на некамерцыйнай аснове дасланыя на конкурс фатаграфіі без выплаты аўтарскага ўзнагароджання.

Работы, дасланыя на конкурс, будуць правераны на арыгінальнасць і ацэнены экспертным журы. Склад журы фарміруюць прадстаўнікі арганізатараў і прафесійныя фатографы. Работы фіналістаў прымуць удзел у выставе на факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ.

**Кантакты:**

Тэл. +375 29 315-13-76 (Telegram, Viber)

E-mail: ziamlia.bielaruskaja@gmail.com

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 18.07.2023 г.
Зак. 608. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123,
Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

**Рэдактар Дар’я Аляксандраўна ПАЎЛЮЧУК**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***